Государственное учреждение образования
«Центр технического и художественного творчества детей и молодежи
Фрунзенского района г.Минска «Зорка»

# Одноактовая пьеса
# «Ідэальныя людзі»

Автор: Романова Александра Михайловна,
педагог дополнительного образования
высшей квалификационной категории

Номинация: «Оригинальный драматургический материал для детского театра»
(для подросткового возраста)

Минск 2023



**Романова Александра Михайловна**, педагог дополнительного образования высшей квалификационной категории, руководитель театральной студии «Премьера» государственного учреждения образования «Центр технического и художественного творчества детей и молодежи Фрунзенского района г.Минска «Зорка».

Закончила в 1994 году Витебское училище искусств по специальности режиссура клубных мероприятий, обрядов и праздников, в 2001 году – Белорусский государственный университет культуры и искусств, по специальности культурология.

В ЦТХТДиМ Фрунзенского района г.Минска «Зорка» работает с августа 2019 года. За время работы принимала участие в V городских педагогических чтениях, III Республиканском конкурсе методических разработок «Воспитательная деятельность: есть идея!», Творческом марафоне #ЛЕТО_ТВОРЧЕСТВО_БЕЛАРУСЬ, Открытом республиканском конкурсе творческих педагогических разработок «Активное и креативное лето» и др.

Театральная студия «Премьера» является дипломантом различных творческих конкурсов, таких как Открытый международный фестиваль-конкурс «Творчество Без Границ», Республиканский открытый творческий конкурс «Поспех», Международный конкурс искусств «Высота».

## Аннотация

Пьеса «Ідэальныя людзі» была специально написана для детского театрального коллектива, которым руководит Александра Михайловна Романова. Действие пьесы происходит за кулисами цирковой арены.

В глазах мальчика с ограниченными возможностями артисты бродячего цирка предстают идеальными людьми, подобными греческим богам. Он мечтает стать одним из них. Но в процессе знакомства ребенок осознает, что это самые обыкновенные люди со своими слабостями и страхами, с трудными характерами и личными взаимоотношениями. Его идеальный мир закулисья рушится. Приходит момент разочарования, а потом переосмысления. Мальчик начинает осознавать, что физические недостатки не являются преградой для воплощения своей мечты.

Постановка пьесы требует от юных артистов владения навыками жонгляжа и техники исполнения трюков и фокусов.

# ІДЭАЛЬНЫЯ ЛЮДЗІ

*Сумнае цыркавое прадстаўленне ў адной дзеі,*
*падгледжанае са службовага ўваходу.*

**Дзеючыя асобы:**
*ХЛОПЧЫК*
*МАМА*
*ГІМНАСТКА*
*ГІМНАСТ*
*АСІЛАК*
*КЛОЎН*
*ФОКУСНІК*

*Дзеянне адбываецца на сцэне, якая выглядае, як задняя частка цырка.*
*ГІМНАСТКА і ГІМНАСТ размінаюцца перад выступленнем.*

ГІМНАСТКА. Ты зноў тут? Можаш не хавацца, я цябе бачу! Ужо месяц, як мы ў вашым горадзе, і амаль кожны дзень ты хаваешся за старой касай і сочыш за намі. Што табе трэба? Ты не з таварыства абароны жывёл? З тых, хто крычыць на кожным кроку, што ў цырках адбываецца бязмежжа, што мы здекуемся з жывёл і што ўсіх нас трэба за краты, а ўсіх жывёл трэба адпусціць у натуральнае асяроддзе.

ХЛОПЧЫК. Не.

ГІМНАСТКА. Тады што ты тут робіш? Ну, не жадаеш адказваць – не адказвай *(некаторы час маўчаць).*

ХЛОПЧЫК. А вы што робіце?

ГІМНАСТКА. Рыхтуемся да выступлення. А чаму ты тут, а не там, не ў зале для гледачоў? У тваіх бацькоў няма грошай, каб адвесці цябе ў цырк? А-а-а-а-а! Я здагадалася, ты жадаеш без білета пракрасціся на прадстаўленне?

ГІМНАСТ. Шмат вас тут такіх ашываецца!

ХЛОПЧЫК. *(Выходзіць храмаючы.)* Я ўжо быў на самым першым. І я цябе ведаю, ты – птушка!

ГІМНАСТКА. Скажаш, птушка! Самая звычайная паветраная гімнастка.

ГІМНАСТ. Цябе доўга чакаць?

ГІМНАСТКА. Я зараз *(гімнасту, затым к хлопчыку)*. З нагой што?

ХЛОПЧЫК. Нічога. Я такім нарадзіўся.

ГІМНАСТКА. Прабач! Я не хацела…

ХЛОПЧЫК. Я не пакрыўдзіўся. Ты ж не ведала. Я ўжо прывык.

АСІЛАК. Чаму на тэрыторыі староннія?

ГІМНАСТКА. Гэта мой новы сябар…

АСІЛАК. Рыхтавацца трэба, а не сяброў заводзіць *(сыходзіць)*.

ХЛОПЧЫК. Я яму не спадабаўся?

ГІМНАСТКА. Ды не, ён проста вельмі сур'ёзны і адказны, кожны ж дзень жыццём рызыкуем.

ХЛОПЧЫК. Ён такі дужы, моцны! Я пра такіх у кнізе чытаў "Легенды і міфы старажытнай Грэцыі". Як бы я хацеў быць такім!

ГІМНАСТКА. Часта крыўдзяць?

ХЛОПЧЫК. Часта. "Храманожкай", "калекай"… Але я ўжо прывык і не звяртаю ўвагі. Мама кажа, што ў мяне толькі ножка хворая, а ў іх душа і розум. *(Летуценна.)* Але я мару аб тым, што калі-небудзь адбудзецца цуд, і я буду здаровым і стану такім, як вы – спрытным, дужым, навучуся, як ты, лятаць, ці жангліраваць, а можа я стану знакамітым дрэсіроўшчыкам тыграў… і тады мяне ніхто не зможа дражніць і здзекавацца з мяне.

ГІМНАСТ. *(Нецярплівa.)* Алёна!

ГІМНАСТКА. Мы самі робім цуды, калі ў іх сапраўды верым. Мне пара. Прадстаўленне пачынаецца, наш выхад першы.

ХЛОПЧЫК. Можна я цябе тут пачакаю?

*ГІМНАСТКА зацвярджальна ківае. Сыходзяць з ГІМНАСТАМ на манеж. ХЛОПЧЫК падыходзіць да зачыненых куліс шатра і зазірае. З арэны даносяцца гукі музыкі, крыкі "але - ап" і апладысменты. Да ХЛОПЧЫКА падыходзіць ФОКУСНІК, паказвае фокус і сыходзіць.*
*ХЛОПЧЫК зачаравана глядзіць яму ў след.*

КЛОЎН. Ну, чаго рот разявіў? Што ты тут робіш? Бацькі твае дзе?

ХЛОПЧЫК. Мама дома… А я чакаю.

КЛОЎН. Дай здагадаюся. І чакаць табе патрэбна менавіта тут – на тэрыторыі цырка і менавіта зараз – у час прадстаўлення!

ХЛОПЧЫК. Так! А адкуль вы ведаеце?

КЛОЎН. Хлопчык, ты перашкаджаеш, ідзі адсюль.

ХЛОПЧЫК. Як жа я пайду?

КЛОЎН. Нагамі. Ідзі-ідзі. *(Глядзіць у след хлопчыку.)* Стой! Чаго адразу не сказаў, што ў цябе тут важная справа. Важная ж? Я ж думала, ты так, ад нечага рабіць тут стаіш.

ХЛОПЧЫК. А можна мне нос прымерыць?

КЛОЎН. Мара ўсяго жыцця?

ХЛОПЧЫК. Так. А адкуль ..?

КЛОЎН. *(Напускае на сябе таямнічы від.)* Табе 11 гадоў, ты вучышся ў 6 класе, добра вучышся, жывеш разам з маці, любіш чытаць кнігі, марыш пра сабаку, але табе не дазваляюць яго заводзіць. А яшчэ ты верыш у цуды.

ХЛОПЧЫК. *(Зачаравана.)* Так! Неверагодна! Ты экстрасэнс!!!

КЛОЎН. Не, я клоўн!

АСІЛАК. *(Выходзіць, паказваючы на хлопчыка.)* Гэта?

КЛОЎН. Мой новы сябар.

АСІЛАК. Зразумела. Выхад не прапусці! *(Сыходзіць.)*

ХЛОПЧЫК. Я яму зноў не спадабаўся!

КЛОЎН. Падчас прадстаўлення ён заўсёды такі – вельмі адказны!

*Выходзіць ГІМНАСТКА з ГІМНАСТАМ.*

ГІМНАСТ. Ну, ведаеш! Гэта ўжо ні ў якія вароты! Я кожны раз не ведаю, чаго ад цябе чакаць! Трэба было яшчэ больш паразмаўляць і наогул на манеж не выходзіць!

*ГІМНАСТКА садзіцца на пол, абхоплівае рукамі калені і сядзіць нерухома, гледзячы ў адну кропку.*

ХЛОПЧЫК. Што з ёй?

КЛОЎН. Не звяртай увагі. Крыху пасядзіць і зноў будзе як новенькая. *(Паварочваецца і з крыкам "А вось і я!" выбягае на манеж.)*

ХЛОПЧЫК. Птушачка, што з табой?

*Да іх падыходзіць ФОКУСНІК. Здымае капялюш. Паказвае, што ён пусты, потым дастае з яго цукерку, укладае ў руку ГІМНАСТКІ, потым зноў дастае з пустога капялюша яшчэ адну цукерку ХЛОПЧЫКУ і садзіцца побач. ХЛОПЧЫК здымае з яго галавы капялюш, але там нічога няма.*

ХЛОПЧЫК. Больш няма? Шкада. *(Пытаецца.)* А ты знаём з чараўнікам Ізумруднага горада? Не? Шкада. Я пра яго ў адной кнізе чытаў, ён можа здейсніць самыя запаветныя жадані. У мяне ёсць адно. *(Пытаецца зноў.)* А ў цябе ёсць такое жаданне? Самае-самае запаветнае, ну падумай крышачку: чаго табе ў жыцці не хапае? Няўжо ў цябе ўсё ёсць? Мая мама кажа, што чалавеку амаль заўсёды чаго-небудзь не хапае для поўнага шчасцця. Я рады, што пазнаёміўся з усімі вамі! Вы ўсе незвычайныя, можаце тое, што не могуць простыя людзі. Вы – ідэальныя людзі! Як бы я хацеў быць такім, як вы!

АСІЛАК. *(Да фокусніка.)* Дай здагадаюся! Твой новы сябар! *(Нервова.)* Дзіцячы сад! *(Сыходзіць.)*

*ФОКУСНІК дастае ў ХЛОПЧЫКА з-за вуха цукерку і ідзе на манеж. З'яўляецца клоўн. Садзіцца так, як ГІМНАСТКА.*

ХЛОПЧЫК. Цяпер і ты так сядзець будзеш, як птушачка?

КЛОЎН. Я? Неее, я не буду. Зараз мы і птушачку тваю лётаць заставім. *(Да гімнасткі.)* Раз, два, тры – птушка ажыві!

ГІМНАСТКА. Хто?

КЛОЎН. Фокуснік.

ГІМНАСТКА. Хутчэй-хутчэй-хутчэй!

ХЛОПЧЫК. А што здарылася?

КЛОЎН. У цырку, патрэбна ўсё рабіць вельмі хутка, каб ніхто нічога не заўважыў і каб ніколі не спазніцца на свой выхад. Але-ап!

*ГІМНАСТКА заходзіць за шырму і выходзіць з другога боку ў іншым адзенні.*

АСІЛАК. Я гляджу, ты тут ужо прапісацца сабраўся.

*АСІЛАК, ГІМНАСТКА і КЛОЎН сыходзяць на манеж. ХЛОПЧЫК падглядвае ў шчылінку занавеса за прадстаўленнем і па яго рэакцыях можна здагадацца, што адбываецца на манежы.*

ХЛОПЧЫК. Застацца б тут на ўсё жыццё!

*З'яўляецца ФОКУСНІК. Паказвае фокус з мячамі, жангліруе, атдае іх ХЛОПЧЫКУ і сыходзіць. ХЛОПЧЫК намагаецца паўтарыць, але ў яго нічога не атрымліваецца.*

ХЛОПЧЫК. Але я ім не патрэбен! Ад мяне не будзе ніякай карысці. Калі толькі за жывёламі прыбіраць? *(Хаваецца за старую кассу.)*

*З манежа вяртаюцца КЛОЎН, ГІМНАСТКА і АСІЛАК.*

АСІЛАК. *(Да гімнасткі.)* Што з табой сёння? Трэба давяраць таму, хто цябе страхуе! Яшчэ адзін выхад і ўсё.

*ГІМНАСТКА садзіцца абняўшы калені і маўчыць. КЛОЎН садзіцца побач.*

ГІМНАСТКА. Што мне рабіць?

КЛОЎН. Перастаць баяцца.

ГІМНАСТКА. Як? Я нічога не магу з сабой зрабіць. Кожны раз, калі я падымаюся пад купал, на адно імгненне мільгае думка аб тым, што я магу зваліцца… І я ўяўляю сабе, як ляжу на арэне з паламанай шыяй. Зрэдку бывае, што я не паспяваю аб гэтым падумаць і тады я станаўлюся…

КЛОЎН. Птушкай! Можа ўжо хопіць баяцца і навучыцца проста жыць па-суседску са сваімі фобіямі.

ГІМНАСТКА. Ты ведаеш, як гэта зрабіць?

КЛОЎН. Раней ведала. У мінулым жыцці. Гэты хлопчык, які быў тут… Людзі жорсткія, асабліва дзеці. Я больш чым упэўнена, сверснікі смяюцца з яго, дражняць, і ўсё таму, што ён не падобны да іх, не такі. Вось і я была не такой,

мяне таксама крыўдзілі, абзывалі “парсючком”, рохкалі ў спіну і смяяліся. *(Працягвае.)* Ён здзівіўся адкуль я ведаю, што ён многа чытае і марыць пра сабаку. Калі з табой не жадаюць сябраваць, толькі і застаецца, што марыць аб верным сябры, які ніколі не здрадзіць, і чытаць кнігі, каб уяўляць сябе героем. Я нават спрабавала навучыцца жыць з гэтым, вучылася на псіхолага, але лепей мне ад гэтага не стала, тады я стала клоўнам.

ГІМНАСТКА. Арыгінальны ўчынак!

КЛОЎН. Я меркавала так, няхай людзі смяюцца з клоўна, з яго выгляда і з яго нязграбнасці, калі ім так хочацца, а не з мяне.

ГІМНАСТКА. А мне што рабіць? Кожнае маё выступленне – гэта барацьба з самой сабой і са сваімі страхамі.

КЛОЎН. Дык можа табе ўжо пара перакваліфіцыравацца?

ГІМНАСТКА. Ты аб чым?

КЛОЎН. Увага! Увага! Спяшайцеся бачыць! Толькі адно прадстаўленне! Вялікая барацьбітка са страхамі – мадмуазель Птушка!

*КЛОЎН экіпіруе ГІМНАСТКУ з падручных сродкаў у сярэднявечнага рыцара, як бы выстаўляючы яе на бой. Потым дастае з кішэні мыш. ГІМНАСТКА пужаецца і вісчыць ад гэтага, крычыць і ХЛОПЧЫК. Ад нечаканага крыка ХЛОПЧЫКА пужаецца і крычыць КЛОЎН. Калі ўсе трое разглядаюць, чаго яны напужаліся, пачынаюць смяяцца.*

ГІМНАСТ. Гурток вар’ятаў!

КЛОЎН. Далучайся!

ГІМНАСТ. *(Не звяртаючы на яе ўвагі, затым хлопчыку.)* Што табе тут трэба? Чаго ты тут блытаешся? Без цябе тут праблем хапае!

ГІМНАСТКА. Не крычы на яго! Чаго ты як з ланцуга сарваўся? Ён не вінаваты ў нашых праблемах.

ГІМНАСТ. Гэта ў цябе праблемы! Я раблю сольны номер і сыходжу. А ты заставайся, Каралева купала! Дзе яна, тая Каралева? Дзе? Нязграбная курыца!

АСІЛАК. Хопіць! Хопіць.

ГІМНАСТ. А вось і абаронца з’явіўся!

АСІЛАК. Я здымаю вас сёння з прадстаўлення. У такім стане нельга на трапецыю. *(Гімнаст, фокуснік і клоўн сыходзяць.) (Да гімнасткі.)* Ну, што з табой?

ГІМНАСТКА. Я баюся! Пасля таго, як ты сарваўся з трапецыі і ляжаў на апілках, як паламаная лялька, я ўвесь час чакаю, што і са мной можа такое здарыцца.

АСІЛАК. Калі так і будзеш трэсціся перад кожным выхадам, то абавязкова здарыцца. Ты ж паймі, у тым, што са мною здарылася я сам вінаваты. Адважыўся на яшчэ не падрыхтаваны, неадрэпетыраваны трук. Захацеў пакрасавацца перад публікай смяротным номерам. Вось і паплаціўся за сваю саманадзейнасць *(сыходзіць)*.

ГІМНАСТКА. *(Хлопчыку.)* Кожную ноч, калі ўсе кладуцца спаць, я хаваюся за фаргангам і сачу за яго рэпетыцыямі. Бачу як ён сцісквае зубы і жанглюе ядрамі, п’е абязбольвальнае і вяртаецца к вагам, зноў п’е і зноў… А потым гадзіну ляжыць нерухома на апілках і, немігаючы, глядзіць уверх *(падхопліваецца, выцірае слёзы).* Ведаеш, калі ён упаў, ніхто не верыў, што ён будзе хадзіць, не тое, што вернецца на манеж. А я верыла! Першае, што я рабіла, калі мы прыязджалі ў новы горад на гастролі – ішла ў храм і малілася за яго.

ХЛОПЧЫК. А можаш за мяне памаліцца? Каб я таксама мог хадзіць?

ГІМНАСТКА. Я паспрабую… Але…

ХЛОПЧЫК. Я разумею, ты мяне не кахаеш, так як кахаеш яго і таму цуд можа не адбыцца.

ГІМНАСТКА. Маленькі ты яшчэ пра каханне тут разважаць. *(Прыслухоўваецца.)* Ціха! Парад-але! *(Выбягае на манеж.)*

*ХЛОПЧЫК застаецца адзін, садзіцца і абхоплівае галаву рукамі.*
*Уваходзіць МАМА.*

МАМА. Я так і ведала што ты тут! З самага першага дня ты прыходзіш сюды, табе тут мёдам памазалі? Светлячок! Ты чуеш мяне?

ХЛОПЧЫК. Чую! Не хвалюйся, больш не прыйду сюды ніколі ў жыцці!

МАМА. Што здарылася? У цябе што-небудзь баліць?

ХЛОПЧЫК. Не, не баліць.

МАМА. Цябе пакрыўдзілі?

ХЛОПЧЫК. Ніхто мяне не крыўдзіў!

МАМА. Тады што?

ХЛОПЧЫК. Я лічыў іх ідэальнымі! Падобнымі да алімпійскіх багоў! А яны не такія! Яны падманшчыкі! Яны такія ж, як і ўсе: хварэюць, баяцца, крычаць адзін на аднаго.

МАМА. Яны ўсяго толькі людзі, простыя людзі. Не трэба ад іх патрабаваць і чакаць чагосьці незвычайнага. Яны ж не вінаватыя ў тым, што ў цябе вельмі багатая фантазія. Час старажытнагрэчаскіх багоў і герояў даўно мінуў, на зямлі засталіся толькі людзі.

АСІЛАК. Гэта вы добра сказалі пра багоў і пра людзей! Не злуйся на нас хлопча, проста ў нас прафесія такая. І на нас лепш глядзець з глядзельнай залы, чым з задворкаў – расчаравання менш.

ГІМНАСТКА. Даруй нам, сёння было апошняе прадстаўленне ў вашым горадзе, заўтра мы з’язджаем. Але я табе абяцаю, што буду маліцца за тваё выздараўленне. Але ты сам павінен верыць у сябе.

КЛОЎН. Бывай! Трымай на памяць *(здымае клоўнскі нос і аддае хлопчыку)*.

*ФОКУСНІК жанглюе мячамі і таксама аддае іх ХЛОПЧЫКУ.*
*МАМА і ХЛОПЧЫК сыходзяць.*

АСІЛАК. Ну і дзень сёння! Зараз адпачываць, а потым рыхтуемся да ад’езду.

*Выходзіць ГІМНАСТ з чамаданчыкам.*

ГІМНАСТ. Вы рыхтуйцеся, а я ўжо ад’язджаю.

АСІЛАК. Ты канчаткова вырашыў? Шкадаваць не будзеш?

ГІМНАСТ. А што шкадаваць, аб чым? Пачаў рэчы свае збіраць, дык атрымалася, што ў мяне амаль нічога няма, вось *(паказвае на чамаданчык)*.

КЛОЎН. Вырашыў – дык бывай, трымаць не будзем.

АСІЛАК. Шчасліва!

*ГІМНАСТ развітваецца з кожным. Сыходзіць, але хутка вяртаецца.*

ГІМНАСТ. Не магу я так болей, не магу. Кожны дзень адно і тое ж. Пераезды, выступленні, правінцыйныя мястэчкі. А я хачу выступаць у сталічным цырку, а не ў вашым занюханым балагане. Хачу, каб маё імя было надрукавана на афішах вялікімі літарамі, а не хавацца за надпісам "Цырк де ла луна". Я стаміўся так жыць *(сыходзіць).*

КЛОЎН. Вось гэта развітальная гастроль!

АСІЛАК. Ладна, сёння быў цяжкі дзень, усім адпачываць.

*Усе сыходзяць. З'яўляецца ХЛОПЧЫК, хаваецца. Выходзіць АСІЛАК. Спрабуе займацца, але ў яго няма настрою. Выходзіць ФОКУСНІК.*

АСІЛАК. Што, таксама не адпачываецца. Нейкае адчуванне, што павінна нешта здарыцца. *(Сядзяць нейкі час моўчкі.)* А чым адрозніваецца сталічны цырк ад правінцыйнага? Наша прызначэнне дарыць людзям свята, вяртаць іх у дзяцінства, не даваць ім губляць веру ў цуд. І няма ніякай розніцы, дзе гэта рабіць. Вось адкажы, чаму так бывае, што з іншым чалавекам размаўляеш на адной мове, але не разумеце адзін аднаго, а з другім і слоў ніякіх не трэба. Не ведаеш? Вось і я не ведаю… *(Сыходзіць.)*

*ФОКУСНІК яшчэ нейкі час сядзіць і робіць нейкія дзіўныя маніпуляцыі. Убягае МАМА.*

МАМА. Дзе мой сын? Светлячок. Хлопчык, які быў у вас сёння. Я ведаю ён дзейсці тут. Вось чытайце: "Мама, не хвалюйся за мяне. Я ўсё зразумеў, яны такія ж, як я, і таму я павінен быць з імі. Не шукай мяне. Калі я стану багатым і знакамітым, я вярнуся. Светлячок". Дзе ён? Вярніце мне майго хлопчыка. Светлячок – гэта адзінае, што ёсць у маім няшчасным жыцці. *(Плача, фокуснік працягвае ёй насоўку.)* Яго бацька сышоў ад нас, калі сказалі, што хлопчык хворы і ніколі не зможа хадзіць. Але мне было ўсё роўна. Я паставіла перад сабой мэту. Лякарні, аперацыі, паліклінікі, санаторыі і зноў лякарні, аперацыі… Але гэта ніштo ў параўнанні з тым, што мой хлопчык зможа хадзіць. Ну чаго вы ўсё маўчыцё? Скажыце хоць што-небудзь. *(У гэты час фокуснік паказвае фокус з кветкай.)* Вы здзекуецеся? Дзе мой сын? Гаварыце.

КЛОЎН. Не трэба так крычаць, Ігнат вам нічога не скажа, нават калі вельмі захоча.

АСІЛАК. Ён нямы.

МАМА. *(Глядзіць на фокусніка, потым пачынае плакаць яшчэ больш, потым звяртаецца да яго.)* Дайце вашу насоўку! *(Дастае з кішэні яго камізэлькі насоўку, другую, трэццяю, чым больш звязаных насовак выцягваецца з кішэні, тым больш усе пачынаюць смяяцца. З надзеяй глядзіць на фокусніка.)* Знайдзіце мне майго сына!

*ФОКУСНІК азіраецца на сваіх калег. Тыя паказваюць, каб ён замінаў увагу мамы, а яны тым часам пачнуць шукаць ХЛОПЧЫКА. ФОКУСНІК робіць від, што шукае ХЛОПЧЫКА, паказвае фокусы са знікненнем чалавека. Але ХЛОПЧЫКА нідзе няма. Калі цягнуць час ужо няма ніякай магчымасці, ён паказвае фокус з чароўнай скрыняй і там знаходзіць Алеся, які мірна спіць ў скрыні.*

МАМА. Светлячок! Дзякуй, дзякуй вам! Вы сапраўдны чараўнік! Сыночак!

ХЛОПЧЫК. *(Прасынаецца.)* Мама! Як ты мяне знайшла?

МАМА. Навошта ты гэтак зрабіў? Навошта збег з дому? Я ледзь не звар’яцела!

ХЛОПЧЫК. Я ж пакінуў запіску, каб ты не хвалявалася. Я хачу стаць такім, як яны, я б прыехаў у наш горад на гастролі і ніхто не пазнаў бы ў знакамітым артысце цырка храманожку, над якім усе смяяліся і абражалі.

МАМА. Ну, што за глупства!

КЛОЎН. А ён правы!

МАМА. Што? Ну ведаеце, гэта ўжо ні ў якія вароты! *(Алесю.)* Хуценька пайшлі да дому.

ГІМНАСТКА. Пачакайце, калі ласка!

АСІЛАК. Не спяшайцеся! Паглядзіце якая сёння цудоўная ноч, на небе поўны месяц.

МАМА. Якая ноч, які месяц? Вы ўсе звар’яцелі?

КЛОЎН. Сёння ноч цудаў! Увага, увага! Сёння і больш ніколі, толькі адно начное…

ГІМНАСТКА. Чароўнае…

АСІЛАК. Таямнічае…

УСЕ РАЗАМ. Прадстаўленне цырка “Де ла луна”!

КЛОЎН. Абсалютна бясплатна!

ГІМНАСТКА. Толькі для выбранных асоб!

АСІЛАК. Сардэчна запрашаем!

*Гучыць музыка, пачынаецца імправізаванае цыркавое прадстаўленне для ХЛОПЧЫКА і МАМЫ. КЛОЎН выконвае абавязкі шпрэхшталмейсцера. Усе артысты мяняюцца ролямі. МАМА і Алесь таксама становяцца дзеючымі асобамі гэтага дзейства. Напрыканцы КЛОЎН аб’яўляе “смяротны нумар”– “Жанчына-птушка!” МАМУ паднімаюць высока на рукі. Пасля гэтага дзеянне ўсіх дарослых персанажаў замаруджваецца ў два разы. ХЛОПЧЫК бярэ мячы і спачатку неўпэўнена жангляваць, а потым у яго атрымліваецца ўсё лепш і лепш. Дзеянне зноў вяртаецца ў адзін рытм. Пачынаецца парад-але (паклон).*